Конечно, есть в Туркмении и положительное. Самые большие успехи – во внешней политике. В 1995 году Организация Объединённых Наций признала Туркменистан постоянно нейтральным государством. Такой статус (фактически, как у Швейцарии) был достигнут, в первую очередь, благодаря именно Ниязову. Несомненным плюсом внутри страны является стабильность, что особенно ценно в сравнении с положением у соседей. Стабильность преподносится официальной пропагандой исключительно как заслуга Ниязова. Фактор «сильной руки», конечно, нельзя сбрасывать со счетов. Но, как представляется, основа внутренней стабильности – в менталитете самих туркменов. Так, кстати, было и во времена СССР. Туркмения была самой спокойной и бесконфликтной республикой. Политика нейтралитета и внутренняя стабильность обеспечивают приток инвестиций. Их могло быть и больше, но в стране не создана законодательная база, защищающая инвесторов от потери своих денег. Личных гарантий Сапармурата Ниязова для некоторых инвесторов недостаточно. Положительным также является то, что огромные средства от продажи нефти и газа (Туркменистан обладает более 30% мировых запасов углеводородного сырья) тратятся прежде всего на строительство промышленных предприятий, спортивных сооружений, памятников и парков. В 2000 году сдан в эксплуатацию крупнейший текстильный комплекс "Туркменбаши", продукция которого поставляется в США и страны Европейского Союза, а в самом Туркменистане фирменные джинсы стоят 4-5 долларов. В Ашгабате построен лучший в Центральной Азии аэропорт, восемнадцать супер-отелей, два стадиона. Центр столицы преображён до неузнаваемости. По сути, это целый комплекс прекрасных зданий, музеев и парков под открытым небом с многочисленными памятниками национальным героям, скульптурами, фонтанами, с тысячами светящихся ночью фонарей. Это красота, которую надо увидеть.

КЛЯТВА

Туркменистан,
Отчизна любимая,
край родимый мой.
И в мыслях, и сердцем
я всегда с тобой.
За малейшее зло,
причинённое тебе,
да отнимется рука моя.
За малейший навет на тебя
да обессилеет язык мой.
В час измены Родине,
Сапармурату Туркменбаши,
священному стягу твоему
да прервётся дыхание моё.

(Ежедневно перед началом занятий школьники произносят эту клятву)

Уровень жизни в Туркменистане не намного ниже, чем в Беларуси. Официальный курс национальной валюты – 5 200 манат за доллар. Обменных пунктов для граждан нет, а на чёрном рынке за доллар дают 22 000 манат. Средняя пенсия там около 35 долларов. На работу устроиться очень трудно. Средняя зарплата не выше 50 долларов. Даже в столице зарплата в 80 долларов считается высокой. Но надо учитывать, что в Туркменистане бесплатные газ, вода, соль, электричество. Квартплата чисто символическая. Проезд в общественном транспорте стоит 50 манат – четыре белорусских рубля. 50 литров бензина на заправке стоят 25 000 манат, что чуть больше одного доллара. Хлеб стоит 600 манат – около 50 белорусских рублей. Водка в 1,5 раза дешевле, чем в Беларуси. Психология «чаркі і шкваркі» тут культивируется также весьма успешно.

Внешне в стране как бы нет проблем, в обществе полная гармония. Нет ни оппозиции, ни оппозиционных газет. Все всем довольны. Власть Ниязова настолько укрепилась, что он немного ослабил тотальный контроль за своими гражданами и с 1 января 2002 года разрешил выезд гражданам Туркменистана в иностранные государства без оформления внутренних виз на выезд. Но очевидно, что даже по сравнению с брежневскими временами гражданское общество в Туркменистане отброшено назад. Независимые социологические опросы в Туркменистане невозможны, но и так видно, что в людях поселился страх, которого раньше не было. Уезжают некогда самые многочисленные национальные меньшинства – русские, армяне и другие. Осенью 2001 года один из министров, только оказавшись в Москве, объявил о своей оппозиционности и о том, что Туркменбаши ворует. А простому человеку бежать некуда. Международное сообщество предпочитает не замечать «недостатки» внутри страны. Нефтегазовая труба перевешивает демократические принципы. Да и сами туркмены не ищут виноватых на стороне. Тем же, кто занят такими поисками внутри родной страны, Туркменбаши в типично восточном стиле ответил: «Как-то один маленький мальчик спросил меня: "Когда закончится золотой век?" Признаться, я не сразу нашёлся, что ответить. Сегодня отвечаю и мальчику, и всем, кто может задаться подобным вопросом: пока живы туркмены, золотой век не кончится!».

Михась ВОРОНЕЦ

P.S. Михась Воронец, будучи военным, в 1981-1982 г.г. служил в Ашгабате. До распада Союза ежегодно бывал в Туркмении, навещая родственников жены. Очередная поездка состоялась через 10 лет, в 2002 году.

СПАДЧЫНА

ПАРЭЧЧА

Ў АКТАХ СЛОНІМСКАГА ЗЕМСКАГА СУДА


Фота IREX/ProMedia

Шмат Парэччаў на Беларусі. Толькі ў Гродзенскай вобласці ёсць чатыры значныя паселішчы, якія носяць такую назву. Яны размешчаны ў Гродзенскім, Дзятлаўскім, Лідскім і Слонімскім раёнах. Справа пойдзе аб родным мне Парэччы, што на Слонімшчыне. Сама назва вёскі гаворыць аб тым, што яна знаходзіцца "па рэчцы". Так, Парэчча ляжыць на левым беразе ракі Шчары, на 80-ым кіламетры ад яе ўпадзення ў Нёман. Калі раней адлегласці паміж паселішчамі адлічваліся ад паштовых станцый, дык Парэчча знаходзілася ў 7 вярстах ад слонімскай пошты. На Шчары — ад Слоніма да Парэчча — знаходзяцца вёскі Талькаўшчына, Разанаўшчына, Міцькавічы і Васілевічы (апошняя злілася з Жылічамі). За Парэччам — Задвор'е, Шундры, Камлявічы, Паўлавічы і Ніз. Раней вёска мела Г-падобную забудову, адзін канец яе вуліцы ўпіраўся ў Шчару і называўся "Сялянцамі", а другі ішоў у накірунку Слоніма і называўся "Пескамі".

Землі вакол вёскі ў асноўным пясчаныя і супясчаныя ды камяністыя, а значыць бедныя. Гэта адбылося таму, што калі ішоў ляднік і, як вялізны бульдозер, пёр перад сабою горы пяску, гліны і камянёў, дзесьці каля Парэчча ён затрымаўся і пакінуў пясчаныя ўзгоркі з даволі крутымі схіламі, парэзанымі равамі і засмечанымі камянямі. Гара "Каўпак", вышынёю каля 30 м, якая знаходзіцца прыкладна ў 1 км ад вёскі, мае ідэальную конусападобную форму, аб'яўлена Міністэрствам прыродных рэсурсаў адзіным помнікам такога кшталту ў Беларусі. Вёску з поўначы прыкрывае ад халодных вятроў гара, якую называюць Екшынавай. З яе добра праглядваецца ўся лугавая пойма Шчары аж да Слоніма. За Шчарою пачынаецца вялікі лясны масіў. Ён раней называўся Парэцкай дачай і ўваходзіў у склад Слонімскай пушчы.

Удалае спалучэнне ракі, лесу, палёў ды высокіх узгоркаў здаўна прыцягвала ўвагу людзей. Як сведчаць даследаванні слонімскага археолага Васіля Супруна, па абодвух берагах Шчары ад Слоніма да Нізу (у тым ліку ва ўрочышчы "Буслаўка" каля Парэчча) выяўлены пяць паселішчаў неалітнага, бронзавага і пазнейшых часоў. А каля вёсак Камлявічы, Мілашэвічы і Рудня выяўлены месцы, дзе прыкладна ў 12-15 стагоддзях людзі выплаўлялі жалеза з балотнай руды.

Згодна з паданнем, якое расказаў мой бацька, раней паселішча было ў другім месцы, каля гары Каўпак, у цяперашнім урочышчы "Данілаўскае", і вёска называлася Данілавічы. Але потым перасяленцы пацягнуліся бліжэй да ракі, і сляды паселішча сцерліся. Аб верагоднасці таго, што там было паселішча, сведчаць асаблівасці гэтага ўрочышча. Яно ўяўляе сабой катлавіну, акружаную з трох бакоў (апрача ўсходняга) высокімі ўзгоркамі, якія прыкрывалі яе ад паўночных халодных вятроў. Побач лес і высокая гара Каўпак, якая ў даўнейшыя часы мела стратэгічнае прызначэнне як назіральны пункт, з якога была відаць уся ваколіца. Ва ўрочышчы б'е з зямлі чысцюткая крыніца, якая вясною ператвараецца ў рачулку Берашчоўку. Луг, па якім працякае, а потым і губляецца ў ім рачулка, быў добрым выпасам для жывёлы. Нават мікраклімат тут лепшы, бо месца зацішнае і ў меру халаднаватае ў спёку. А нядаўна знойдзены архіўныя матэрыялы, якія сведчаць, што тут, у Данілавічах, яшчэ ў 1827 годзе было паселішча, у якім жыло 17 рэвізскіх душ мужчынскага полу.

Першае пісьмовае згадванне пра Парэчча мною знойдзена ў Актах Слонімскага земскага суда за 1556-1571 г.г. У даведніку аб мясцовасцях у XXII томе Парэчча ўпамінаецца ў 9 актах. На старонцы 29 у акце № 47 ад 7 лістапада 1556 года, які называецца "Мировая между Лаврином Медведским и Гришком Тамковичам", апісваецца справа аб тым, як Грышка Тамковіч пабіў Лаўрына Мядзвецкага, а потым у судзе яны памірыліся. Аб сведках гэтага прымірэння запісана ў арыгінале так: "А на тот час были земяне господарьскии повету Слонимского пан Миколай Станкевич, хоружий с Плехова, а пан Станислав Янович Талько Порецкий, а пан Матуш Писарский, сестрынец Лаврына Медвецкого".

Такім чынам, 7 лістапада 1556 года — першае архіўнае ўпамінанне аб Парэччы.

Я быў яшчэ не зусім упэўнены, што Станіслаў Янавіч Талько Парэцкі — гэта жыхар нашага Парэчча. Але мае сумненні развеяў акт № 345 ад 18 верасня 1565 г., які называецца: "Жалоба Ивана Порецкого на своего брата Станислава за нанесение ему побоев". Там сцвярджаецца: "... пан Ян Янович Талько Порецкий, жалуючи и оповедаючи на брата своего Станислава Яновича Талько Порецкого ж о том, иж будучи мне з ним в одном дворе в Поречу, але в особливом доме, то пак он, не маючи до мене жадное потребы и пришедши в дом мой, маючи под сукнею таемную бронь, меня самого збил и зранил, якож я тогож часу тое найстье его на дом мой, збитье и зраненье мое возному поветоваму Станиславу Буйне жаловал, ставши до книг сознал..."

Назва вёскі Парэчча сустракаецца ў "Решении на жалобе Николая Юндила на Лаврына Оревицкого за укрывательство сбежавших от него крестьян" у 1556 годзе. Наступнае згадванне пра Парэчча каля Шчары датуецца 31 ліпенем 1559 года ў "Заявлении возного о вручении Анне Талькович позва". У ім павятовы возны Станіслаў Міхайловіч паведамляе, што гаспадарскі земянін Троцкага павета Іван Звязда паслаў яго, як павятовага віжа, са службоўцам сваім Сілаю і з напамінальным лістом "... до земянки пани Болтромеевое Талькевича, пани Ганны Богушовны и до сына ей Миколая Болтромеевича, иж што которое имение они своё Васевицкое заставили ему у ста копах грошей литовских и описалися записом своим, иж мели, як земли пашные, так гай, лесы, дубровы, сеножати, заросли, речки очищати, яко есть ширей а достаточней в листе вспоминальном описана, и кеды я возный с оным листом приехал до именья их Порецкого, самой пани Болтромеевое в том имении не было, одно сын её Миколай... поведил... едьте с тым листом до пани матки мои, до дворца за Щарю". З гэтага дакумента становіцца вядома, што гаспадыняю маёнтка Парэчча была Ганна Богушаўна Талькевіч. З іншых спраў даведваемся, што, апрача Ганны Талькевіч, у Парэччы жылі яе сыны Мікалай, Ян, Андрэй і Юрка.

Быў яшчэ нейкі сумнеў: у сённяшнім Парэччы няма людзей з прозвішчамі Талько (ці Талькевічы), Баўтрамеевы, Тамковічы. Тут жывуць Селівончыкі, Талерчыкі, Жывулькі, Якімовічы, Герасімчыкі, Галёнкі, Ягоўдзікі, Емяльянчыкі, Барташы, Скокі і іншыя. Але пры далейшым вывучэнні судовых спраў гэты сумнеў развеяўся. У справе, датаванай 22 верасня 1565 года, пад назвай "Заявление Ивана Крамковского о нанесении Есьманом побоев крестьянам Нарбута Порецкого", гаворыцца аб тым, што сяляне Нарбута Парэцкага забілі каля вёскі Огнешычы лася, "... и вбивши возложыли его на воз, хотечи везти его до двора панского Поречья, то как панове Есьманове, доведавшиеся того и вспадши на коне з слугами и з многими подданными своими Сынковскими, прибегши на тое село Огнешичи пана моего, кгвалтовне хлопов побили, поранили и лося отнели". У гэтай заяве звяртае на сябе ўвагу ўпамінанне двух сёлаў: Огнешычы (цяпер Ягнешычы) ды Сынковічы. Гэтыя вёскі маюцца на сённяшняй карце і знаходзяцца ў 5-7 кіламетрах ад Парэчча.

У Актах слонімскага суда згадваецца шмат назваў сённяшніх вёсак, акружаючых Парэчча, і нават урочышчаў. Яны пацвярджаюць думку, што ўсюды размова ідзе пра слонімскае Парэчча. Так, у "Закладной записи Ивана Талько Ивану Милевскому на три участка земли", датаванай 12 кастрычніка 1570 года, апавядаецца аб тым, што Ян Мілеўскі "... закупил у шурина своего, пана Яна Балтромеевича Талько три поля, каждое поле по три бочки, первое поле у Лазени, другое под Жиличи, третье у Кузнищах, голые поля у шести копах грошей литовских". Адно з парэцкіх урочышчаў і сёння называецца Лазень, а ў двух кіламетрах ад Парэчча ёсць вёска Жылічы.

У другім "Заявлении Ивана Милевского о взятии в залог земли своей тёщи Анны Тальковой" ідзе размова аб тым, што "... земенин господарьский повету Слонимского Ян Милевский оповедал, иждей закупил есми землю у тещи своее пани Ганны Богушовны Болтромеевое и в сынов её Яна, Юрья и Андрея, прозываемою Сеньковскою, с которой дэй земли служба зупольная на двор её была." Сянькоўшчына — гэта вёска ў 7 км ад Парэчча. Як бачым, гаспадар зямель памяняўся, ім стаў Мілеўскі. Колькі гаспадароў Парэчча памянялася, дакладна пакуль невядома.

(Працяг будзе)

Аляксандр ТАЛЕРЧЫК,
Гродна

ПОЛЬШЧА. АД ПРЫНЯЦЦЯ КАНСТЫТУЦЫІ 3 МАЯ 1791 ГОДА І ДА НАШЫХ ДЗЁН

**(Заканчэнне.
Пачатак у №№16 — 19, 21)**

Жыць і супрацоўнічаць па-суседску

Распад Рэчы Паспалітай, паўстанні, войны, рэвалюцыі на працягу двух вякоў, доўгае панаванне на нашай зямлі Расіі, узнікненне, а потым і распад СССР прывялі да таго, што маем сёння. Расія і Польшча адступілі з Беларусі на свае этнічныя тэрыторыі. На вялікіх прасторах былога ВКЛ узніклі незалежныя суверэнныя Беларусь, Літва, Украіна. Межы не павінны раз'ядноўваць народы, якія стагоддзямі жылі разам. Кожны народ выбірае свой шлях у будучае. Мы ўступілі ў цесны саюз з Расіяй, для гэтага былі і ёсць важкія прычыны. Польшча з'яўляецца членам НАТА, і мы павінны зразумець гэты выбар палякаў. Не заўсёды мы застаемся суседзямі. Мы, беларусы, жывем з Польшчай у адным еўрапейскім доме. Як ужо адзначалася, на працягу ўсёй нашай гісторыі мы былі арганічна звязаны вельмі падобным гістарычным лёсам, барацьбой за сваё існаванне, блізкай мовай і культурай, цеснымі гаспадарчымі сувязямі.

Нас аб'ядноўваюць імёны А.Міцкевіча, Э.Ажэшка, Т.Касцюшкі, С.Манюшкі, І.Дамейкі, В.Урублеўскага, Р.Траўгута і многіх іншых слаўных сыноў нашай зямлі.

Мы, беларусы, па розных прычынах значна адсталі ад суседзяў-палякаў у рэалізацыі так неабходных эканамічных рэформ, і тым больш актуальны абмен вопытам, каб не дапусціць сур'ёзных памылак тых, хто ішоў першым.

Вельмі добра, што супрацоўніцтва паміж намі, так бы мовіць, на гарызантальным узроўні пашыраецца і ўмацоўваецца з кожным днём. Праз нашу мяжу штодзённа праходзяць сотні цягнікоў, тысячы аўтамабіляў з пасажырамі і таварамі, перапампоўваецца велізарная колькасць нафты і газу, ідзе праз мяжу электраэнергія. Знаходзяць паразуменне паміж сабой мытнікі, памежнікі, чыгуначнікі, газавікі, сувязісты, кіраўнікі гандлёвых і гаспадарчых фірм. Усталяваліся карысныя сувязі паміж гарадамі-пабрацімамі, вышэйшымі навучальнымі ўстановамі. Праводзяцца двухбаковыя семінары і дзелавыя сустрэчы.

У гаспадарчым плане не выкарыстоўваюцца ўсе магчымасці выгаднага гандлю, інвестыцый, абмену вопытам і тэхналогіямі ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы. Ёсць перспектывы выкарыстання польскіх партоў на Балтыцы, асваення Аўгустоўскага і Днепра-Бугскага каналаў, захавання Белавежы, аховы экалогіі, пашырэння турызму.

Беларусы разумеюць польскую мову, цікавяцца польскай літаратурай, песняй, сцэнічным мастацтвам. Нават у савецкі час з ПНР у нашыя кніжныя магазіны Мінска, Гродна завозілася польская літаратура, праводзіліся фестывалі польскай песні ў Віцебску і савецкай у Польшчы ў Зялёнай Гуры, Сопаце. Людзі захапляліся выканаўчым мастацтвам Ганны Герман, Марылі Радовіч, ансамблямі "Мазовшэ", "Курпе Зелёнэ", "Шлёнск", кінааматарствам рэжысёраў А.Вайды, К.Занусі, Э. Кавалеровіча, акцёраў З.Цыбульскага, Б.Брыльскай, С.Мікульскага і многіх іншых.

Некалькі разоў я ўдзельнічаў у польска-беларускіх мітынгах, якія амаль штогод праводзіліся ў 60-70 гадах у раёне Свіслачы і Бераставіцы то на нашым, то на польскім баку мяжы. Гэтыя мерапрыемствы, задуманыя як палітычныя, ператвараліся ў свята прыязні, шчырасці, знаёмстваў дзесяткаў тысяч раней незнаёмых людзей на канцэртах, у арганізаваных тут, у лесе, буфетах, ці пад хвоямі і бярозкамі за кілішкам "Сталічнай" ці "Выбаровай".

Цяпер іншы час, але магчыма карысна было б успомніць нешта добрае з недалёкага мінулага і, напрыклад, арганізаваць на мяжы супольны дзень адпачынку ў цёплы травеньскі ці чэрвеньскі дзень з канцэртамі, буфетамі, выязднымі крамамі і т.п. Як адзначалася раней, гэты артыкул прысвечаны дзяржаўнаму святу Польшчы — Дню Канстытуцыі 3 мая. З той пары, калі прымалася першая Канстытуцыя Рэчы Паспалітай, і да нашых дзён, мы, брацкія славянскія народы і суседзі, змагаемся за лепшую долю, разам або побач шукаем сваё месца сярод народаў Еўропы.


Палякі свята захоўваюць традыцыі. На працягу больш двух вякоў у Польшчы ўрачыста адзначаецца дзяржаўнае свята — Дзень Канстытуцыі 3 мая.

Мы віншуем суседзяў са святам.

Эдуард АРОЧКА,
сакавік 2002г.

ПОЧТА

НЕ ДАЙТЕ СЕБЯ ОБМАНУТЬ!



Постоянным читателям «Газеты Слонімскай» уже знаком Сергей Евменов, — его стихотворения не раз публиковались на литературной странице нашего издания.

Напомним, что Сергей – слонимчанин, который на данный момент отбывает срок в местах лишения свободы. Судя по стихотворениям и письмам на адрес редакции, Сергей – талантливый человек.

Сегодня мы предлагаем вашему вниманию, уважаемые читатели, жизненные случаи, рассказанные другом Сергея. Надеемся, что, прочитав их, вы никогда не попадетесь на удочку аферистов, которых в наше время слишком уж много.

Новые истории-предупреждения будут опубликованы в ближайших номерах «Газеты Слонімскай".

Здравствуйте, уважаемые читатели «Газеты Слонімскай"! Волей обстоятельств, на протяжении уже нескольких лет я вынужден общаться с ограниченным кругом людей (дело в том, что я нахожусь в МЛС). К счастью, среди них встречаются довольно образованные, приятные в общении личности. С одним из таких я даже подружился. Я могу беседовать с ним часами на абсолютно разные темы и почти всегда узнаю что-то новое и интересное для себя.

Однажды во время очередного разговора мой новый друг рассказал мне о некоторых мошеннических операциях, "провернутых" им и его товарищами в недавнем прошлом.

С разрешения своего друга, я решил поделиться частью полученной информации с читателями "ГС", чтобы помочь людям не попасться на уловки предприимчивых аферистов. Может быть, это поможет многим избежать обмана.

Вариант "Для доверчивых стариков"

Несколько молодых, респектабельного вида людей приходят в дом к престарелому человеку, представляются посланниками, например, ОБСЕ, ЮНЕСКО и т.д. и выдают гуманитарную помощь. Обрадованная старушка или дедушка безмерно благодарны за такую помощь. Молодые люди ничего не требуют взамен, а просят всего лишь расписаться в документе, заверяющем факт передачи гуманитарной помощи. Для подписи даются три экземпляра, верхний – действительный, а вот остальные два... – либо завещание, либо дарственная на дом (квартиру, машину и т.д.). Где же старики разберутся?

Далее обычно следует милое прощание, благодарные речи пенсионеров и поощрительные улыбки "добродетелей", которым только и остается, что завизировать полученные бумаги у нотариуса (либо нотариус – "свой человек", либо нужно подделывать печать). После этого "добрые" дяди ждут, когда старики отойдут в мир иной. Вот тут-то и появятся новоиспеченные "внуки", "племянники" и т.д. А оспорить потом с настоящими наследниками свершившееся деяние (особенно, если нотариус был "свой") практически невозможно.

Вариант "Покупки оптом"

Два человека неспешно ходят по вещевому рынку. Найдя людей, предлагающих товар оптом, потенциальные покупатели дают понять, что данные вещи им понравились. Немного торга, проверки качества и выбранную одежду начинают аккуратно складывать в сумки. Как правило, вещи выбираются добротные, а, следовательно, дорогие. После того, как сумка оказывается доверху полна одеждой, «покупатели» говорят, что на руках у них нет таких больших денег (не хватает, опасаются с собой носить, забыли кошелек...). Потом одному или двум продавцам предлагается проехать к ресторану, где якобы работают «покупатели», либо к дому, где они живут, чтобы забрать нужную сумму. Обычно редко находятся люди, которые отказываются от хорошей сделки. Далее ловится «случайный» частник, сумка с товаром помещается в багажник автомобиля. Вскоре они оказываются в нужном месте, допустим, возле ресторана. В ресторане, как правило, есть второй выход. Тут-то и начинается игра со «случайным» водителем машины, который, как оказывается, очень сильно торопится и не соглашается подождать несколько минут, пока принесут деньги. Вскоре находится компромисс: продавцу предлагается выйти из машины и подождать некоторое время на улице, пока покупатели вынесут деньги и вызовут такси. Для успокоения нервов, мол, все без обмана, из багажника машины достается точно такая же сумка и отдается на временное попечение хозяев. В ней, как потом выясняется, вместо приобретенной одежды находится равносильная по весу куча хлеба (возможны варианты). Пока доверчивые продавцы ждут заработанные деньги, предприимчивые «покупатели» спокойно уходят через дополнительный выход, садятся к тому «случайному» частнику с настоящей сумкой в багажнике, и все вместе едут отмечать удачную афёру.

Вариант «Вежливый попутчик»

В зал ожидания на авто либо ж\д вокзал, тяжело пыхтя, заходит человек, который тащит на себе две-три объемные сумки. Отыскав взглядом свободное место рядом с таким же, обязательно одиноким человеком, он садится возле него и начинает разговор «ни о чем». Если в ходе такого разговора выясняется, что человек ждет своего поезда или автобуса и ждать еще будет час-полтора, то предпринимается второй шаг. Звучит вежливая просьба присмотреть за сумками, пока мошенник отлучится "перекусить" в буфет. Редко кто откажет и... владельца багажа (к слову сказать, состоящего из старых телогреек, газет и т.д.) не видно в течение 15-30 минут, после чего он возвращается и спокойно начинает читать газету. В восьмидесяти случаях из ста ничего не подозревающий пассажир поступит аналогично мошеннику: он попросит присмотреть за своими сумками, пока уже он отлучится. Естественно, по возвращению незадачливый человек находит лишь вещи, оставленные аферистом...

Так что, будьте, пожалуйста, внимательными!

Сергей ЕВМЕНОВ

НЯВЫДУМАНАЯ ГІСТОРЫЯ

Плата за ласку

Праз сон ёй мроілася, што недзе далёка плача дзіця. Стала бегчы на гэты плач, бо мацярынскім сэрцам чула: бяда з яе дзіцём. Але з каторым: Сабінай ці Фэляй, Маняй ці Антосем, Міхасём ці Сцяпанам? Ногі правальваліся ў багну, перарывалася дыханне, а яна ўсё шукала і не магла знайсці, адкуль гэты плач...

Прачнулася. За акном плакала, стагнала мяцеліца. У хаце было цёмна і холадна. У кутку за шафай скрабліся мышы. Нерухома ляжала, уставіўшыся вачамі ў цемру. Яна не ведала, колькі гадзін, ці хутка раніца. Ды і не хацела ведаць. Гэта не раней, у маладосці, калі была сям'я, дзеці. Тады, ледзь прахапіўшыся, яна паліла запалку і пазірала на гадзіннік: хаця ж не праспаць. Трэба было паліць у печы, упраўляцца ля жывёлы, будзіць дзяцей. Каго да вучобы, каго да работы. У вялікай сям'і Змачынскіх з Дубровіцкага хутара кожны меў сабе занятак. І цётка Алеся тады была гаспадыняй. І гаспадыняй добрай. Яны з мужам Казімірам умелі зарабляць капейку. Умелі не берагчы. Тры дачкі і тры сыны былі заўсёды модна апранутыя. Бывала, яшчэ толькі ў моду ўваходзіць якая вопратка, а яе дочкі ўжо фарсяць у абноўках па суседняй вёсцы Моліцы і па суседнім мястэчку. Вясковыя жыхары і цяпер нярэдка ўспамінаюць, як была ў яе Сабіны прыгожая чырвоная сукенка з ружовым каўнярам. Як прыйдзе ў мястэчка на кірмаш, то людзі міжволі абарочваліся на модную прыгажуню. Астатнія дочкі і сыны таксама не былі абдзелены бацькоўскай ласкай. І не думала, не гадала тады цётка Алеся, што век свой будзе дажываць у халоднай хаце, на занесеным снегам хутары. Не ведала, што ўсе без выключэння дзеці будуць з нецярпеннем чакаць яе смерці.

Калі памёр бацька, а маці моцна занядужала, то пакідаць яе на хутары было брыдка. Людзі ў вочы праўдай калолі. А браць старэнькую да сябе ніхто не хацеў. І тады ўсіх дзяцей цёткі Алесі паклікалі ў мясцовы Савет. Невыпадкова паклікалі: Сабіна, Фэля, Антось і Маня жывуць у мястэчку. Добра жывуць. Маня і Антось маюць уласныя дамы, Сабіна і Фэля — кватэры з усімі зручнасцямі. Праўда, Міхась і Сцяпан пасяліліся ў гарадах, але і яны прыехалі, каб "падзяліць маму". Вырашылі: няхай па два месяцы жыве ў кожнага па парадку. Дзеці будуць перадаваць яе адзін другому як эстафету бяздушнасці і чэрствасці. Але калі чарга дайшла да Сабіны і Фэлі, то яны парушылі гэтую жорсткую гульню: не захацелі, каб маці і ноч у іх пераначавала. Прыйшлося вярнуць цётку Алесю на Дубровіцкі хутар і аддаць на волю лёсу. Дзеці перасталі баяцца сораму і граху. Турбавала толькі адно: каб па якой-небудзь прычыне маці не трапіла да яго ў хату, каб не прыйшлося дзяліць з ёй жыллё і хлеб.



Малюнак Яўгена ІВАНОВА

Ад мястэчка да хутара па снезе цягнецца ланцужок слядоў. Па іх паволі рухаецца наша машына: мы едзем да цёткі Алесі на горкае гасціяванне. З сабой запрасілі Сабіну, якая працуе ў местачковым Доме культуры.

— Гэта сляды брата, — кажа Сабіна Казіміраўна. — Антось сёння да мамы хадзіў. Яго чарга. А я ўчора была. Толькі ўдваіх мы сюды і наведваемся. Астатнія браты і сёстры нават вачэй не паказваюць.

— Ды ці не прасцей было б вам узяць маму да сябе, чым кожны дзень хадзіць за тры кіламетры па такім бездарожжы? — кажу Сабіне Казіміраўне.

— А чаму менавіта я? — ледзь не падскочыла тая. — А астатнія дзеці чаму ня яе не бяруць? І давай пералічваць: Мані яна тое дала, Фэлі — другое, Антосю — трэцяе...

Машына спынілася воддаль ад хутара, бо з-за снегу бліжэй пад'ехаць не ўдалося. Мы з Сабінай пайшлі да цёмнай хаты. Пастукалі ў акно. Ніхто не аказаўся. Пацягнулі за клямку — дзверы адчынены. Уключылі святло, і я ўбачыла, што на ложку ляжыць старэнькая бабулька. Глянуўшы на нас, яна намагалася ўстаць, але не змагла і ціха застагнала. Замест падушкі пад галавой ляжаў нейкі клуначак з адзеннем. Коўдры зусім не было. Вакол бруд, запусценне.

— Забярыце мяне адсюль, — ледзь чутна папрасіла старэнькая.

— Куды ж я цябе забяру? — адказала дачка. — У мяне і так цесна. Няхай Антось бярэ ці Маня.

— Не хочуць яны, і ты не хочаш..., — прастагнала бабулька.

Змоўклі. Я глядзела на гэтую сцэну і старалася ўявіць, як Сабіна Казіміраўна па абавязку службы "нясе ў масы культуру", праводзіць розныя мерапрыемствы, выхоўвае ў людскіх сэрцах дабрыню, спагаду, міласэрнасць, а на хутары ў брудзе і адзіноце ляжыць яе старэнькая, бездапаможная мама, якая нарадзіла на свет, зберагла ад хвароб, адзіны чалавек на свеце, на плячы якога можна выплакаць сваё гора, чыё добрае слова змяншаць душэўны і фізічны боль, супакоіць і абнадзеіць.

Сабіна Казіміраўна, нарэшце, згадзілася ўзяць маму.

— Толькі да вясны, — паставіла яна мне ультыматум. — А там як хоча.

Словам, да цяпла мае прытулак цётка Алеся. А дзе ж прытуліць галаву яна потым, хто з дзяцей адплаціць ёй за ласку і клопаты?

Іду ў магазін, дзе працуе другая дачка бабулькі — Фэля.

— І не прасіце, — сказала, як адрэзала, яна. — Я жыву адна: муж памёр, сын жыве асобна, але маці не вазьму. Ды, прынамсі, чаму менавіта я павінна яе браць? Ёсць жа і другія дзеці.

Да трэцяй дачкі, Мані, падступіцца было не так проста. Каля дабротнага дома на дзве палавіны (у адной, між іншым, жывуць кватаранты) бегалі два злыя сабакі, ахоўвалі гаспадарскае дабро. І калі, нарэшце, мяне пусцілі ў хату, ступіць баялася: усюды чысціня, парадак, адчуваецца дастатак. На мяккіх пухавіках сядзела сама Марыя Казіміраўна.

— Пра гэта нават гаварыць няма чаго, маці я да сябе не вазьму. Я сама ўжо старая, на пенсіі. Праўда, яшчэ працую. Але гэта да справы не адносіцца.

"Да справы" дачка адносіць стосік квітанцый на паштовыя пераводы, якія яна хавае, відаць, многія гады запар.

— Вось, — з гордасцю паказвае яна іх. — Я кожны месяц пасылаю маці крыху грошай. А глядзець могуць і другія дзеці, чаму абавязкова я?

— І другія не хочуць. Таксама адпіхваюць ад сябе.

— Ёсць яшчэ адзін варыянт, — "падказала" мая субяседніца. — Няхай мясцовыя ўлады выдзеляць ёй які-небудзь пакойчык у мястэчку. Тады Сабіне і Антосю будзе бліжэй хадзіць яе даглядаць.

Вось так. Марыя Казіміраўна адкупілася грашамі. Сабіна ўзяла маці толькі да вясны, а як надыдзе цяпло, зноў завязе на хутар і кіне адну. Па чарзе з братам будуць хадзіць туды нібыта паесці насіць, а на самой жа справе з таемнай надзеяй у сэрцы: можа, часам, памерла за ноч. Вось каб так, то і ўсе клопаты скончыліся б.

Што цяпер для бабулі Алесі грошы, калі яна не можа ўстаць з ложка. Ды яе хоць золатам абсып, лягчэй ад гэтага не будзе. Ні грошы, ні багацце не заменяць добрага сэрца, у якім жывуць спагада і любоў. Не такімі выраслі яе дзеці. Скваппнасць і раўнадушша, душэўная глухата і бессаромнасць зрабілі родных сясцёр і братоў чужымі, а старэнькую, слабую маці — няшчаснай і лішняй.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ

ФУТБОЛ. ПЕРШАЯ ЛІГА

ЗГУЛЯЛІ З НАСТРОЕМ, ПРЫГОЖА І ВЫНІКОВА

"Камунальнік" (Слонім) — "Нёман" (Масты), 4 - 1

Слонім. 25 траўня.
Стадыён "Дынама". 1 000 гледачоў.
Суддзя: Валерый Язевіч (Ліда).
"Камунальнік": Курыловіч, Вольскі (К), Майсейчык, Горбач, В. Дзегіль, А. Дзегіль (Зюлеў, 82), Срыбненка (Лапко, 87), Астапчык, Ясеенка, Аначэнка (Цыганенка, 58), Феранчук.
Галы: Белаш, 2 (Нёман); А. Дзегіль, 6; Ясеенка, 36 (з пенальці); Вольскі, 70; Срыбненка, 79 (Камунальнік).



Упартая барацьба ішла да фінальнага свісткa

Такога шчырага футбола, як у мінулую суботу, Слонім не бачыў даўно. Абедзве каманды выйшлі на поле з жаданнем перамагчы. Ва ўсялякім выпадку, у абароне ніхто адседжвацца не збіраўся.

Ужо на першай хвіліне матчу Іван Срыбненка прабівае па варотах мастаўчан, але — вышэй перакладзіны. А ў наступную хвіліну контратака гасцей прыводзіць да ўзяцця варотаў "Камунальніка". Адкрыў лік у матчы Белаш — 0:1.

Прапушчаны гол не збянтэжыў гаспадароў, і ўжо праз 5 хвілін слонімцы адыграліся. Пасля розыгрышу штрафнога забіць гол пашанцавала Анатолю Дзегілю, — 1:1.

Гульня і надалей ішла на сустрэчных курсах, ды толькі слонімцы больш камбінавалі ў сярэдзіне поля. А актыўныя дзеянні нашых футбалістаў на падыходзе да штрафной гасцей уносілі блытаніну ў дзеянні мастоўскіх абаронцаў. Яны раз-пораз парушалі правілы і на 35-й хвіліне "нарваліся" на пенальці. У штрафной "Нёмана" збілі Срыбненку; 11-метровы ўдар неадхільна прабіў Павел Ясеенка. 2:1, — з гэтым лікам першы тайм і скончыўся.

Другая палова гульні таксама засталася за "Камунальнікам", хоць і мастаўчане ўпарта ішлі наперад. У слонімцаў у атацы яскрава гулялі Ясеенка і Феранчук, пад нападаючымі яксна дзейнічаў Срыбненка, у сярэдзіне поля гаспадароў Астапчык. І небяспечныя моманты ўзнікалі ў прапорцыі недзе 4 да 1 на карысць гаспадароў. Чарговы з іх прывёў да трэцяга гола ў вароты "Нёмана". Падачу з левага фланга атакі слонімцаў галавой замкнуў Аляксандр Вольскі, — 3:1.

А за 5 хвілін да заканчэння матчу Срыбненка давёў лік гульні да буйнога. Гасцям падалося, што выконваць чарговы штрафны павінны менавіта яны. Усёй камандай "Нёман" пайшоў наперад, і нават варатар выйшаў да лініі штрафной плошчы. Але суддзя паказаў, што штрафны — на карысць гаспадароў. Срыбненка не стаў доўга разважаць і прабіў здалёк, — варатар гасцей у "рамку" вярнуцца не паспеў. 4:1, — перамога, якая ўзняла слонімскую каманду на чатыры радкі ўверх у турнірнай табліцы.

Чарговы матч "Камунальнік" згуляе 1 чэрвеня ў Бярозе.

Валерый КАВАЛЕНКА

Вынікі астатніх матчаў 6-га тура:

Граніт – Дынама-Юні,	2-0
Ліда – Дарыда,	1-3
Днепр-ДЮСШ-1 – Лакаматыў,	0-0
Смаргонь – Хімік,	0-0
Нафтан – Тарпеда-Кадзіна,	3-2
Ведрыч-97 – Асіповічы,	4-0
ЗЛіН – Бяроза,	3-1

Турнірная табліца пасля 6-га тура

		гульні	В	Н	П	ачкі	мячы
1.	Ведрыч-97	6	5	0	1	15	16-4
2.	Нафтан	6	4	2	0	14	13-4
3.	Дарыда	6	4	2	0	14	12-4
4.	Лакаматыў	6	3	2	1	11	11-4
5.	ЗЛіН	6	3	1	2	10	9-7
6.	Днепр-ДЮСШ-1	6	2	4	0	10	10-6
7.	Граніт	6	3	1	2	10	7-5
8.	Тарпеда-Кадзіна	6	2	3	1	9	10-7
9.	Хімік	6	2	2	2	8	10-8
10.	Смаргонь	6	2	2	2	8	5-3
11.	Камунальнік	6	2	0	4	6	8-19
12.	Асіповічы	6	1	2	3	5	5-13
13.	Дынама-Юні	6	1	1	4	4	7-12
14.	Нёман	6	1	1	4	4	10-20
15.	Бяроза	6	1	0	5	3	3-11
16.	Ліда	6	0	1	5	1	5-14

ФУТБОЛ

ПОБЕДА БЫЛА ТАК БЛИЗКА

В рамках спартакиады школьников 1987 года рождения в Гродно прошли соревнования по футболу. 11 команд-участниц были разбиты на две подгруппы.

Слонимчане в своей подгруппе в первой игре проиграли "Белкарду" 0:1, после выиграли у Волковыска, 4:0 (по два гола забили Игорь Ляшевич и Евгений Снопко). В следующем матче победили Зельву с минимальным преимуществом, 1:0 (гол на счету Павла Ахроловича) и в заключительной встрече предварительной стадии нанесли поражение Сморгони, 3:0 (отличились Игорь Ляшевич, Антон Бубнов и Евгений Снопко). В итоге, команда Слонима заняла первое место в своей подгруппе и вышла в финал соревнований, где предстояла игра с командой Гродно-1.

В первом тайме финального матча на поле шла игра равных по силам команд, и на перерыв футболисты отправились при счете 0:0. Во второй половине игры инициативу на себя взял Игорь Ляшевич. Он обыграл трех полевых игроков гродненцев, уложил на газон вратаря хозяев и открыл счет матча, 1:0 в пользу слонимчан. Забитый гол придал гостям уверенности, и это, по словам тренера Руслана Корнева, сыграло плохую службу нашей команде. Ошибка судьи, и счет становится 1:1. После этого последовали две ошибки уже в наших оборонных порядках, которые позволили гродненцам выйти вперед, 1:3. Слонимчане продолжали бороться, но переломить исход встречи в свою пользу не смогли. В итоге, — второе место в турнире.

Тем не менее, в сборную команду области вошли шесть слонимчан: Андрей Бондарович (СШ №3), Павел Ахралович (СШ №10), Игорь Ляшевич (RM "БАТЭ", Борисов), Антон Бубнов, Евгений Снопко и Олег Тарасюк (все — СШ №7, ДЮСШ "Альбертин", тренер Александр Гусар).

Кроме этих ребят за команду Слонима выступали еще Анатолий Криштопчик (СШ №3), Олег Якимовец (СШ №4, ДЮСШ "Альбертин"), Святослав Солодухо (СШ №9, тренер Виктор Асаевич), Вячеслав Тышко, Сергей Иванашко (оба — СШ №7, ДЮСШ "Альбертин"), Сергей Гусар (гимназия №1, ДЮСШ "Альбертин"), Анатолий Орочко, Андрей Матушко и Дмитрий Юзвович (все — СШ №8).

Валерий КОВАЛЕНКО

ВОЛЕЙБОЛ. СТРИТБОЛ

ПРАЗДНИК СПОРТСМЕНОВ-ЛЮБИТЕЛЕЙ ПРОШЕЛ СКРОМНО

Ко Дню физкультурника Слонимский районный спорткомитет провел в Слониме соревнования по стритболу и волейболу.

В волейбольном турнире приняло участие всего три команды. И уверенную победу здесь одержали спортсмены колхоза "1 Мая" в составе Николая Гулевича, Григория Ешану, Александра Санько, Виктора Назаренко, Александра Русака и Виктора Боровика.

Более массовыми и зрелищными получились состязания по стритболу. В борьбу за звание победителя турнира включилось 8 команд. Но успех сопутствовал команде "Союз-5", в состав которой были заявлены Евгений Жилинский, Андрей Жабский и Алексей Рымарь. Второе место — у спортсменов Новодевятковичей.

Валерий КОВАЛЕНКО

ЧЕМПИОНАТ ОБЛАСТИ

ТАКИЕ РАЗНЫЕ МАТЧИ

Три игры розыгрыша первенства Гродненской области по футболу провел КФК "Слоним" на прошлой неделе.

В понедельник, 20 мая, слонимчане на выезде уступили "Неману" из Березовки, 1:0. А в четверг, 23 мая, в Слониме наши футболисты одержали убедительную победу над ФК "Новогрудок", — 4:0. Дубль на счету Георгия Татарашвили, и по одному мячу забили Евгений Савонь и Александр Семенов. 26 мая, в воскресенье, слонимчан принимал на своем поле мостовский "Неман-2". Счет игры — 2:2. Голы в ворота мостовчан забили Виталий Рудько и Игорь Зюлев.

Следующий матч КФК "Слоним" проводит дома 2 июня против "Сахкомбината" (Скидель). Начало игры на ст. "Динамо" в 17.00.

Валерий КОВАЛЕНКО

ГРЕБЛЯ

В ЗАСЛАВЛЕ СЛОНИМЧАНЕ БЫЛИ НА ВИДУ

В середине мая гребной канал Заславля, что под Минском, принимал ряд соревнований по гребле на байдарках и каноэ.

Слонимчане Валерий Дубовик (КМС, СШ №8) и Константин Король (КМС, гимназия №1) приняли участие в открытых Олимпийских днях молодежи Беларуси среди юношей 1986-87 г. р. В байдарке-двойке они наиболее успешно выступили на 500-метровке, где одержали победу. На километровой дистанции вновь-таки в байдарке-двойке наши ребята пришли к финишу вторыми, а в эстафете 4Х500 м — третьими.



Валерий Дубовик и Константин Король на очередной тренировке в Слониме

В байдарке-одиночке на 500 метрах Валерий Дубовик отметился вторым местом, а Константин Король был четвертым.

Параллельно в Заславле проходили и республиканские отборочные соревноания по гребле на байдарках и каноэ среди юниоров (1984-85 г. р.). И здесь участие, достаточно успешное, приняли двое воспитанников Слонимской СДЮШОР №2: Дмитрий Лойко и Дмитрий Коваленко (оба — СШ №5). Выступали они только на байдарках-одиночках и показали следующие результаты: на 500 м Лойко был четвертым, он же на 1000-метровке — вторым, а Коваленко на километровой дистанции стал шестым.

По итогам отбора Дмитрий Лойко и Дмитрий Коваленко попали в списки национальной команды Беларуси и будут готовиться к чемпионату Европы среди юниоров, который пройдет в г. Загреб (Хорватия).

Валерий КОВАЛЕНКО

ШАШКІ

ВЫНІК ВЫСТУПЛЕННЯ НЯЎДАЛЫ

У горадзе Белая Царква Кіеўскай вобласці адбылося першынство свету па шашках сярод юніёраў. Удзел у ім прынялі юнакі і дзяўчаты 1983 года нараджэння і маладзейшыя.

У спаборніцтвах дзяўчат Беларусь прадстаўляла сланімчанка Ганна Барысік. У выніку яна заняла 13-е месца сярод васемнаццаці ўдзельніц.

Яўген ІВАНОЎ

ВЯРНУЛІСЯ З УЗНАГАРОДАЙ

Міжнародны шашачны турнір, прысвечаны Дню Перамогі, прайшоў у Гомелі. Каманда Слоніма ў гэтых спаборніцтвах заняла чацвёртае месца.


А вось у асабістым бліц-турніры вучань СШ № 9 Андрэй Мацявін згуляў паспяхова. Ён заняў другое месца і быў узнагароджаны спецыяльным прызам аргкамітэта турніру.

Яўген ІВАНОЎ

• • КОНКУРС • • • КОНКУРС • • • КОНКУРС •

ШАШКІ

Заданне №10




Белыя: a1, a3, b2, d2, e1, e3, e5, g1 (8).
Чорныя: b4, c5, c7, f6, g5, g7, h2, h4 (8).
Белыя пачынаюць і выйграюць.

Рашэнне задання №7
1. e3 – g5 e3 – d2 (калі 1... g3 – f2, то 2. h2 : b8 h6 : f4 3. b8 : e1X)
2. g5 : c1 g3 – f2
3. h2 – g3 f2 : h4
4. c1 – f4 з выйгрышам.

Свае адказы дасылайце на адрас "ГС" з паметкай "шашкі" на працягу двух тыдняў са дня апублікавання задання.

• • КОНКУРС • • • КОНКУРС • • • КОНКУРС •

прогноз погоды



Информация предоставлена сайтом www.meteo.by

на 30 мая - 5 июня

Дата	29		30	
Время суток	ночь	день	ночь	день
Температура, С	16	19	11	20
Скорость ветра, m/sec	3	5	2	2
Дата	31		1	
Время суток	ночь	день	ночь	день
Температура, С	12	22	12	22
Скорость ветра, m/sec	1	2	2	3
Дата	2		3	
Время суток	ночь	день	ночь	день
Температура, С	15	23	14	24
Скорость ветра, m/sec	2	1	1	3
Дата	4		5	
Время суток	ночь	день	ночь	день
Температура, С	13	24	13	21
Скорость ветра, m/sec	1	2	2	4

ГОРОСКОП НА НЕДЕЛЮ

от www.ignio.com

ОВЕН

В понедельник бьющие через край эмоции могут все разрушать на своем пути, поэтому лучше придержать это вулканическое состояние. Постарайтесь не ввязываться в споры. Во вторник начинайте работать на свой успех, в вашей карьере сейчас наступил очень важный период, профессиональные дела нуждаются в тщательной проработке и планировании. Осторожнее относитесь к поступающей информации, и вообще лучше на этой неделе опираться только на проверенные факты. В среду надо соблюдать спокойствие, не нарушать никакими посторонними действиями внутреннего спокойствия и мира в душе.

ТЕЛЕЦ

На этой неделе вам желательно ограничить свою излишнюю активность. Излишняя суета может сослужить плохую службу и отрицательно скажется на вашем авторитете. Если вы не уверены в своих действиях, лучше не спешить, эта предусмотрительность позволит избежать многих проблем в дальнейшем. Не экономьте время на сне, чтобы рассеянность не сыграла с вами злую шутку. Строя планы на будущее, оставьте в резерве еще несколько вариантов, чтобы внезапные изменения не смогли выбить вас из колеи.

БЛИЗНЕЦЫ

Удачно пройдут дела и замыслы, связанные с поездками. Наступает благоприятный период для творческой самореализации. Не обещайте того, что не в силах сделать, так как это может стать причиной многих проблем и недоразумений. Выберите главную задачу, отодвиньте мелкие и не столь важные дела. Вам необходимо реально оценить создавшуюся ситуацию и постараться достичь выгодных договоренностей с партнерами по бизнесу. Наступает новый виток вашего духовного развития, поэтому не забывайте оставлять достаточно времени для собственного развития. В четверг ваши быстрые и решительные действия могут стать для кого-то спасением.

РАК

Желательно не браться за важные дела, по возможности сократите объем работы. Продумывайте свои слова и действия. Возможны перепады настроения, что отразится на работе не всегда с положительной стороны. На этой неделе вероятно поступление абсолютно непредвиденной информации. В четверг вас могут подстеречь служебные интриги. К концу недели удастся привлечь к себе внимание руководства и заручиться поддержкой влиятельных лиц. В воскресенье желательно заняться наведением порядка в доме, но не забывайте об отдыхе.

ЛЕВ

Наступает благоприятное время для карьерных достижений, но для этого вам придется повысить свой профессиональный уровень. Во вторник проявите решительность и активность, а если возникнут какие-то неточности, то ближайшее будущее расставит все по своим местам. Не отказывайтесь от использования окружающих для решения задач и получения от них реальной и своевременной помощи. В пятницу лучше не планировать деловых встреч и переговоров с партнерами, и вас вряд ли поддержит начальство.

ДЕВА

Не бойтесь активных действий для достижения поставленных перед собой целей: приложенные усилия увенчаются хорошими результатами. На этой неделе практически во всем придется надеяться только на свои силы. Перед вами могут открыться новые перспективы, если вы будете проявлять эмоциональное спокойствие и настойчивость. Понедельник может оказаться довольно напряженным днем. Вам необходимо приложить максимум сил и терпения, чтобы не оправдать ожидания недоброжелателей.

ВЕСЫ

На этой неделе желательно строго придерживаться намеченных вами планов. Однако, в понедельник возможен срыв намеченных ранее встреч и переговоров, а с оформлением официальных бумаг много проблем и нервотрепки, поэтому отложите эти дела до пятницы. В четверг постарайтесь сгладить конфликтную ситуацию, и ваш авторитет возрастет, к вам начнут прислушиваться коллеги по работе и начальство. В субботу хорошо бы отправиться в романтическое путешествие, которое вам подарит незабываемые события и впечатления.

СКОРПИОН

Вам необходимо все продумать и серьезно подготовиться к решительному броску вперед. Вернитесь к старым ошибкам, проанализируйте их и сделайте необходимые выводы. Постарайтесь смирить свою гордыню, прислушаться и услышать требования руководства, и тогда дела пойдут на лад. Вам необходимо научиться вписываться во временные рамки, исключите опоздания. От вас может потребоваться быстрота реакции в принятии решений. В пятницу возможны разногласия между вами и детьми.

СТРЕЛЕЦ

На этой недели будет полезно поразмышлять и сопоставить причины и следствия ваших жизненных ситуаций. Не стоит принимать поспешных решений, будьте рассудительны и настойчиво работайте на свое будущее. Во вторник начните воплощать в жизнь свои замыслы, если не используете этот день, то сложно будет наверстать упущенное. В пятницу, после работы, постарайтесь не задерживаться, поспешите домой и проведите вечер в спокойной и комфортной для вас обстановке. Суббота благоприятна для творчества и раскрытия творческого потенциала.

КОЗЕРОГ

На этой неделе многое придется начинать сначала, с чистого листа. Лучше рассчитывать только на свои силы и возможности. Вторник и среда связаны с важными профессиональными решениями. Работа, построенная по индивидуальному плану, будет успешной и принесет ощутимые плоды. Проявите усидчивость и старание. Мелочи могут в дальнейшем сыграть значительную роль. Если ваши действия будут сочетать одновременно напор и смелость, тогда в бизнесе можно достичь хороших результатов.

ВОДОЛЕЙ

У вас появится возможность реализовать свои планы, даже самые сумасбродные. Поэтому не теряйте времени, а действуйте и не бойтесь рисковать, если это необходимо. Ваши успехи в работе не должны отразиться на интересах ваших партнеров, постарайтесь не игнорировать их мнение. Важно не опаздывать, приходить на работу вовремя. События недели будут самыми разнообразными, но общий ритм несколько рваный. Оригинальность, живость и открытый ум позволят вам справиться со многими проблемами, а врожденная дипломатичность позволит разрешить материальные трудности.

РЫБЫ

Посмотрите на свою жизнь с более высоких позиций и действуйте из принципа любви и сострадания. Ваши друзья и коллеги могут доставить дополнительные хлопоты и неприятности. Будут происходить активные операции с денежными средствами. Максимально используйте информацию, свежим взглядом посмотрите на этот огромный и удивительный мир. Использование новых достижений и технологий в работе позволят вам достичь важных результатов, о которых вы недавно только мечтали.

анекдоты

☺ 😐 ☹

Ночь. Однокомнатная квартира. Родители Вовочки хотят заняться любовью. Отец начинает, но мать не соглашается:

- Ребенок не спит!

- Спит! Вовочка, ты спишь? Принеси воды!

Молчание...

- Вот видишь, он спит!

И продолжают начатое дело. Минут через двадцать над ними раздается недовольный голос:

- И долго я тут с водой должен стоять?!

☺ 😐 ☹

- Вася, вот посмотри на нашего соседа. Он каждое утро перед уходом на работу целует свою жену! Почему же ты этого не делаешь?

- Ты что, совсем с ума сошла - я же с этой женщиной едва знаком!

☺ 😐 ☹

Мужик вернулся из туристической поездки в Италию и показывает жене фотографий. Увидев фотографию Пизанской башни, жена говорит:

- Так и знала - ты и там нажрался!

☺ 😐 ☹

- Ты чего вечером делаешь?

- Ничего, я пить бросил...

☺ 😐 ☹

На экраны вышел новый семейный фильм ужасов "Здравствуйте, я ваша теща!"

☺ 😐 ☹

- Папа, почему мы так поздно пришли в магазин за покупками?

- Не болтай! Пили решетку...

☺ 😐 ☹

- Вася, говорят вчера праздник был?

- Не помню.

☺ 😐 ☹

Муж возвращается под утро домой в тяжёлом состоянии...

Жена встречает его у порога и говорит:

- И как ты только можешь вообще мне в лицо смотреть?!

Тот, меланхолично:

- Дорогая, ко всему можно привыкнуть...

КроссворД ОТ Владимира ВАШУТЫ

Синонимов

Каждому слову дайте синоним и отыщите ответ в сетке кроссворда. Из оставшихся букв вы узнаете дерево, цветки которого опыляются летучими мышами.

О	Г	И	П	У	К	А	Б	П	И
К	П	О	П	Б	А	Л	Е	Н	А
О	О	Т	А	З	Ц	И	С	И	П
А	Т	Е	Р	А	А	Н	Г	Н	И
М	С	Е	К	А	Р	А	Т	О	Л
Б	С	Б	О	П	Ф	К	О	Т	О
Р	Т	Ь	С	П	И	М	Р	З	А
А	Н	Т	С	А	Л	Ь	М	А	П
Е	А	С	И	Г	А	Д	Е	Х	Б
М	К	О	Л	Р	А	Н	В	У	О

1.Букварь. **2**. Трап. **3**. Фортепиано. **4**. Лётчик. **5**. Тайна. **6**. Глаз. **7**. Бегемот. **8**. Прибор. **9**. Союз. **10**. Государство. **11**. Резервуар. **12**. Начальник. **13**. Кино. **14**. Пища. **15**. Свидание. **16**. Аромат.



ОТВЕТЫ НА кроссворд (№259)

1. День. 2. Гармоника. 3. Товарищ. 4. Катюша. 5. Солдат. 6. Платочек. 7. Девушка. 8. Шинель. 9. Доблесть. 10. Однополчанин. 11. Праздник. 12. Радость. 13. Батальон. 14. Бой. 15. Молодость. 16. Голос. 17. Офицер. 18. Тишина. 19. Бессмертье. 20. Сад. 21. Смуглянка. 22. Гармонь. 23. Пороша. 24. Память. 25. Любовь. 26. Мама. 27. Боль. 28. Паренёк. 29. Гимнастёрка. 30. Час. 31. Родина. 32. Бог. 33. Приказ.

Газета Слонімская
Рэг. нумар 947
ад 24.03.1997г.

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Віктар ВАЛАДАШЧУК

ЗАСНАВАЛЬНІК
Віктар ВАЛАДАШЧУК

Адрас рэдакцыі:
231800, г.Слонім,
вул. Камсамольская, 8.
Тэлефоны:
рэдакцыі 2-14-39
....................4-79-34
аддзел рэкламы 2-49-39

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць асабістую адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў, іх меркаванні могуць не супадаць з поглядам рэдакцыі.
Рэдакцыя не вядзе перапіску з чытачамі і пакідае за сабою права рукапісы не рэцэнзаваць і не вяртаць.
Рэдакцыя таксама не адказвае за змест рэкламы.

Падпісана да друку
28 траўня 2002г.
Час падпісання 18:00.

Надрукавана
ў Гродзенскім абласным унітарным прадпрыемстве "Слонімская друкарня", г.Слонім, вул. Хлюпіна, 16.
Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах.

Падпісныя індэксы:
64042 (індывідуальная)
63818 (ведамасная)
63646 (льготная)

ЗАКАЗ № 1456

© «Газета Слонімская»
Спасылка на «ГС» абавязковая
Ⓚ Матэрыялы публікуюцца на правах рэкламы

E-MAIL: gs@irex.minsk.by HTTP://gs.promedia.minsk.by Аб'ём — чатыры друкаваныя аркушы

